# Адчуць лёгкасць і — узляцець

**Персанальная выстаўка Яны Сурмачэўскай «Распрастай крылы!» адкрылася ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры». У экспазіцыі — акварэльныя работы творцы, прысвечаныя птушкам Беларусі, мясцовым краявідам і выдатным беларускім творцам. Выстаўка адлюстроўвае багацце нашай флоры і фауны праз мяккі і лёгкі сілуэт акварэльнага жывапісу.**

Яна Сурмачэўская расла ў атачэнні творчых асоб: мастакоў, скульптараў, музыкантаў, што ў значнай ступені паўплывала на выбар жыццёвага і прафесійнага шляху. У 2007 годзе скончыла Мінскую дзяржаўную гімназію-каледж мастацтваў з адзнакай па спецыяльнасці «Дызайн» (графічны). З 2007 да 2012 года навучалася ў Беларускай дзяржаўнай



*«Сініца вусатая», 2024 г.*



*«Апошні дзень лета», 2024 г.*

акадэміі мастацтваў па спецыяльнасці «Дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя».

Падчас сваёй прафесійнай дзейнасці распрацавала шмат разнастайных дызайнерскіх праектаў. У 2015—2016 гг. супрацоўнічала з РУП «Белпошта», ВЦ «Марка»: малявала ад рукі партрэты культурных дзеячаў Беларусі, падрыхтавала арыгінал-макет канверта, маркі і спецыяльнага штэмпеля да значных і юбілейных дат (100 гадоў з дня нараджэння Зінаіды Іванаўны Браварскай, 150-годдзе Льва Самойлавіча Бакста, 150 гадоў з дня нараджэння Мітрафана Віктаравіча Доўнар-Запольскага, Маладзечна — культурная сталіца Беларусі — 2016), якія прадстаўлены ў экспазіцыі.

З 2014 да 2020 года Яна Сурмачэўская займалася рэстаўрацыяй іканапісу. З 2019 года — член Беларускага саюза дызайнераў. Сёння займаецца дызайнам, піша карціны на заказ у розных тэхніках і матэрыялах, а таксама праводзіць майстар-класы па акварэлі.

Выстаўка «Распрастай крылы» — серыя твораў, прысвечаных птушкам Беларусі. Пакуль праект налічвае каля 60 работ, але мастачка плануе «выгадаваць» усіх птушак краіны, а іх больш чым 300 відаў.

«Птушкі — маё захапленне, натхненне, мая філасофія. Колькі сябе памятаю, адчувала крылы за спінай. Заставалася толькі навучыцца лятаць. З дзяцінства я з захапленнем назірала за птушкамі, бо хацелася таксама рассякаць паветра, адчуваць лёгкасць і глядзець на свет з іншага ракурсу. З таго часу я шукаю і знаходжу гэтыя магчымасці. І ў нейкі момант адшукала ідэальны спосаб — распрастаць крылы з дапамогай мастацтва», — падзялілася Яна Сурмачэўская.

У сваёй серыі «Птушкі Беларусі» аўтар імкнецца паказаць любоў да птушак і роднага краю. У кожнай карціне яна спрабуе захаваць кавалачак свайго захаплення, каб было адчуванне, што ў наступны момант птушка варухне крыламі і прыгожа заспявае.

Акварэль — любімая тэхніка Яны Сурмачэўскай. У залежнасці ад характару і выгляду птушкі мастачка выбірае тэхніку: акварэль па-мокраму, ала-прыма, лесіроўка, акварэльная графіка і г. д. «Кожную птушку я выгадоўваю да таго моманту, пакуль яна не паглядзіць на мяне сваімі вачыма і не скажа "Вітаю!" І кожны раз гэтае прывітанне нечаканае і рознае», — расказала творца.

Акрамя птушак, у экспазіцыі прадстаўлены выявы мясцовых і экзатычных жывёл, партрэты і пейзажныя замалёўкі. Апошнія па стылістыцы нагадваюць кірунак кітайскага жывапісу «Хуа Няа» («Кветкі і птушкі»). І гэта невыпадкова, бо матэрыялам для такіх твораў служыць чорная ці каляровая туш, якая па ўласцівасцях нагадвае акварэль. Тонкія, амаль празрыстыя лініі творцы паўтараюць прыродныя сілуэты траў і кветак. Быццам гэта не карціна, а толькі адбітак сапраўдных раслін.

Адметная рыса акварэльнага жывапісу — лёгкасць, свабода і багацце адценняў. Такія творы вельмі складана «перагрузіць», таму кветкі і птушкі, пейзажы і партрэты атрымліваюцца натуральнымі.



*«Кугакаўка шэрая», 2024 г.*

У межах праекта будуць праходзіць сустрэчы і майстар-класы з мастачкай. Падрабязнасці ўдакладняйце ў галерэі «Універсітэт культуры».

Выстаўка працуе да 18 лістапада.

**Лізавета КРУПЯНЬКОВА**